# НавінЫ

БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ "АДРАДЖЭНЬНЕ"

нумар 4 (21) ЧЭРВЕНЬ 2000 г.

Modern History Archives
Archiv Nejnovějších Dějin

## Кроніка

## Кіраўніцтва БНФ наведвае рэгіёны Беларусі

***Пасьля гарачай палітычнай Вясны Фронт вырашыў ня старчваць набраны тэмп працы. З чэрвеня пачаліся паездкі кіраўніцтва БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ у рэгіёны краіны. Днямі фронтаўцы наведалі ўсходнюю Беларусь.***

Намесьнік старшыні БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ Вячаслаў Сіўчык, адказны сакратар Управы Аляксей Кавалец і старшыня Гомельскай абласной арганізацыі БНФ Віктар Раманішка наведалі структуры арганізацыі на Гомельшчыне.

Падчас паездкі адбыліся сустрэчы зь сябрамі суполак у Мазыры, Жыткавічах і Лельчыцах (тут суполка была адноўленая). У Нароўлі была створаная рэгіянальная арганізацыя БНФ. Падчас сустрэчаў зь сябрамі БНФ кіраўнікі Фронту тлумачылі пазыцыю арганізацыі ў беларускіх палітычных актуаліях. Вялікую цікавасьць для сябраў рэгіянальных арганізацыяў мелі пытаньні пра Кангрэс дэмакратычных сілаў, Усебеларускі зьезд за незалежнасьць і пра дзейнасьць БНФ увосень.

**Андрэй УРБАНОВІЧ**

## БНФ – за гарачую ваду

***У прыгарадзе Менску Гатаве людзі засталіся без гарачай вады. Сямітысячнае мястэчка перажывае такое выпрабаваньне ўжо другі год запар – летась гарачая вада тут была адключаная зь лета да самых восеньскіх халадоў.***

Сёньня сытуацыя тая ж самая – да кастрычніка вады ня будзе. Жыхары пратэстуюць супраць такіх адносінаў да сябе з боку ўладаў: ня варта казаць пра тое, што адстутнасьць гарачай вады – гэта ня толькі адсутнасьць выгодаў, але й найпростая небясьпека для здароўя й жыцьця. Як кажуць мясцовыя

***Працяг на стар. 2***



***Падчас Маршу Свабоды – 2, адной з найбольш масавых акцыяў беларускай апазыцыі***

# Якой была Вясна – 2000?

***Прайшоў месяц ад заканчэньня Менскай Вясны – 2000, якая ўжо ўвайшла ў сучасную гісторыю Беларусі. Вясна сталася адным з самых цікавых і пасьпяховых момантаў барацьбы за незалежнасьць. Час, які прайшоў прасьля завяршэньня гарачай палітычнай кампаніі, дае магчымасьць аб'ектыўна паглядзець на ейныя вынікі, даць адзнакі, а таксама і спрагназаваць разьвіцьцё падзеяў на самы бліжэйшы час. "Навіны БНФ" зьвярнуліся з пытаньнямі да людзей, якія актыўна спрычыніліся да арганізацыі й правядзеньня Вясны – 2000. Што яны думаюць пра вынікі кампаніі? Якой бачаць палітычную Восень – 2000?***

**Вячаслаў СІЎЧЫК,** ***намесьнік старшыні БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ***

Вясна 2000 году была вельмі пасьпяховая для апазыцыі. Ні забаронамі, ні спробамі задушыць масавыя акцыі, выступленьні людзей, рэжым нічога ня змог дасягнуць. Менавіта вынікам Вясны-2000 сталі тыя дакумэнты, якія ўжо прынятыя Кангрэсам ЗША; узьніклі новыя падыходы ў адносінах да беларускай сытуацыі ў эўрапейскіх структурах. Калі б не было самаахвярнай барацьбы на вуліцах Менску ды іншых гарадоў падчас вясны 2000 года, гэтых вынікаў мы б ніколі ня мелі.

Хацеў бы выказаць вялікую ўдзячнасьць усяму кіраўніцтву БНФ, шматлікім актывістам Фронту, нашым прыхільнікам, якія прыклалі ўсе намаганьні дзеля таго, каб вясна 2000 году сталася кампаніяй аб'яднанай апазыцыі. Я лічу, што сёньняшні рэжым ня пойдзе на перамовы з апазыцыяй, таму мы ня будзем удзельнічаць у тым, што рэжым называе "выбарамі ў палату прадстаўнікоў". Думаю, што нам усім трэба будзе разам правесьці кампанію "Гарачай восені" – некалькі масавых акцыяў.

Хацеў бы нагадаць: калі ў нас было тры масавыя "Вясны" — у 1996, 97, 2000 годзе, то яшчэ ніводную "Восень" апазыцыі арганізаваць не ўдалося. У гэтую восень нам неабходна праводзіць вулічныя кампаніі. Мне вельмі хацелася б, каб дзеля гэтага былі выкарыстыя тра-

***Працяг на стар. 2***

vytoki.net

## БНФ – за гарачую ваду

Працяг са стар. 1

жыхары, Гатава займае першае месца ў Менскім раёне паводле колькасьці захворваньняў на часотку. Забясьпечваць мястэчка гарачай вадой павінна вялікае прадпрыемства "Другасныя чорныя мэталы", дырэктар якога зьяўляецца дэпутатам раённага Савету – але свае абавязкі прадпрыемства не выконвае.

Зразумела, што далей трываць такую сытуацыю жыхары мястэчка ня могуць. На абарону іхных правоў стала Менская раённая рада БНФ. Яе старшыня, Юрась Зянковіч, сьцьвярджае, што сытуацыю з гарачай вадой у Гатаве выправіць магчыма. "Адказнасьць за такое стаўленьне да жыхароў мястэчка мусіць несьці кіраўніцтва "Другасных чорных мэталаў" на чале зь іхным дырэктарам" – кажа сп. Зянковіч. Цяпер Менская раённая рада БНФ вырашыла ініцыяваць працэс адкліканьня гэтага дырэктара-дэпутата з райсавету.

**Аляксей ШЭІН**

## Баранавіцкая арганізацыя БНФ займаецца праблемамі гораду

Баранавіцкая арганізацыя БНФ "Адраджэньне" спрабуе зьвярнуць увагу кіраўніцтва гораду на надзённыя праблемы: патрабуе самы небясьпечны пешаходны пераход прывесьці ў стан, які б адпавядаў правілам дарожнага руху.

Штодзень сотні й нават тысячы жыхароў і гасьцей гораду праходзяць па пераходзе, дзе няма ні стоп-лініі для аўтамабіляў, ні "зэбры" пешаходаў, а хуткасьць руху транспарту не абмежаваная.

Акрамя таго, Баранавіцкая рада БНФ "Адраджэньне" патрабуе паклasьці асфальт ці ходнікавую плітку хаця б у цэнтры гораду, а таксама адрамантаваць і пафарбаваць агароджу дваroў на гэтым адрэзку.

Мясцовыя фронтаўцы зьвяртаюць увагу, што на рашэньне гэтых праблемаў патрэбныя невялікія сродкі ў параўнаньні з тымі, якія пайшлі на вядомыя ў горадзе "аб'екты", напрыклад, былы гаркам, тэнісныя корты, "народныя" гуляньні й інш.

**Алеся МАРЦІНКЕВІЧ**

## Супрацоўніцтва з жаночымі арганізацыямі

27 траўня ў Бабруйску адбылася сустрэча сябраў БНФ з прадстаўнікамі жаночых арганізацыяў горада. Вынікам спатканьня стала прыняцьце рашэньня аб супрацоўніцтве й узаемадапамозе.

**Алёна ВАЛЫНЕЦ**

vytoki.net

# Якой была Вясна – 2000?

Працяг са стар. 1

дыцыйныя нашыя даты. Пачынаць трэба яшчэ зь лета, 27 ліпеня, у дзясятую гадавіну прыняцьця Дэкляpацыі аб незалежнасьці. Гэтая дата дае нам магчымасьць правесьці шэсьці й мітынгі ня толькі ў Менску, але й у іншых гарадах Беларусі. Тое ж самае тычыцца і Дня вайсковай славы 8 верасьня.

Мы мусім таксама падтрымліваць дзейнасьць прафсаюзаў — гэтай восеньню будуць іхныя акцыі. Думаю, што будзе праведзены й Марш Свабоды-3, і мне вельмі хацелася б каб гэтыя акцыі мелі сапраўды нацыянальны характар, каб гэта былі ня толькі менскія акцыі, каб яны адбываліся ўва ўсіх гарадах і мястэчках Беларусі, бо цяпер толькі ад нашай рашучасьці, нашай арганізаванасьці ўсё й залежыць.

**Вінцук ВЯЧОРКА**, *старшыня БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ*

Вясна – 2000 была, у першую чаргу, імем палітычнай кампаніі, а зусім не сэзону, які, маўляў, быў і закончыўся. Палітычная праца ня скончылася зь Вясной – 2000. Гэта быў плян, які ставіў, магчыма, не глябальныя, але зусім канкрэтныя й рэалістычныя мэты. Перадусім – вярнуць беларускім незалежніцкім палітычным сілам вобраз сілаў рэальных, сілаў, здольных вывесьці на вуліцы дзясяткі тысячаў людзей, прычым ня толькі ў Менску, а яшчэ ў пары дзясяткаў гарадоў. Задачай Вясны – 2000 было прадэманстраваць і Маскве, і заходняму сьвету, што ў Беларусі хапае грамадзкай энэргіі дзеля таго, каб бараніць незалежнасьць і, па-другое, жостка стаяць на пэўных умовах дзеля перамоваў з рэжымам, каб выбары адбываліся ў дэмакратычных варунках. Адразу зазначу, што гэты апошні пункт веснавога парадку дня ў мяне, як і ў многіх, выклікае найбольшы скептыцызм. Я ня надта веру, што Лукашэнка хоць калі-небудзь пагодзіцца на сапраўды дэмакратычныя выбары ў сапраўды дэмакратычных варунках. Але размываньне вэртыкалі, расхістваньне антыдэмакратычнай сыстэмы кіраваньня стварае спрыяльную сытуацыю для вяртаньня канстытуцыйнай законнасьці. І мне здаецца, масавыя акцыі засьведчылі, што мы здольныя выконваць пастаўленыя мэты. Кажучы "мы", я маю на ўвазе і БНФ, і саюзныя з намі палітычныя сілы, зь якімі мы ў нейкіх дэталях, вядома ж, разыходзімся, але згодныя ў галоўным: у абароне незалежнасьці і ў барацьбе супраць дыктатарскага рэжыму.

Своеасаблівым замежнапалітычным падсумаваньнем і праверкай міжнароднага рэйтынгу палітычнай Вясны – 2000 ды "абноўленага" аблічча беларускай незалежніцкай апазыцыі стала мая паездка ў Лёндан і паездка аб'яднанай апазыцыі ў Вашынгтон.

Што тычыцца палітычнага прагнозу на восень, то пазыцыі, набытыя ўвесну, мы ўтрымаем і разаўем. Да чыста палітычных пратэстаў, якія матывуюцца трывогай за лёс незалежнасьці й нянавісьцю да дыктатуры, дададуцца, нарэшце, пратэсты сацыяльныя. Акрамя таго, лукашэнкаўскі рэжым – як ровар. Ён стабільны, пакуль самаўзмацняецца. Як толькі ён запавольвае хаду ўзмацненьня дыктатауры, то валіцца на бок. Тое, што Лукашэнка цяпер ідзе на ўсялякія саступкі: запрашаюць менш прынцыповых прадстаўнікоў палітычнай апазыцыі на БТ, зацягваюць у сумнеўныя дыялёгі – усё гэта мае адваротны бок. Вэртыкаль, асабліва ніжэйшага й сярэдняга ўзроўню, бачыць, што рэжым зусім не такі ўсемагутны, што калі на яго добра цісканугь зь сярэдзіны, беларускаю рукою, то ён адпадзае.

**Юры ХАДЫКА**, *намесьнік старшыні БНФ*

Падзеі вясны 2000-га году выклікаюць у мяне аптымізм. Яны пакінулі ўражаньне арганізаванасьці, прадуманасьці й далі эфэкт нарастаючай. Канешне, можна было б чакаць і большай выніковасьці, але, тым ня менш, колькасьць дэманстрантаў увесь час павялічвалася, і гэта нараджае надзею на восень гэтага году дый на наступны год.

Сапраўднае змаганьне з дыктатурай у нас адбудзецца ў 2001 годзе падчас прэзыдэнцкіх выбараў. Таму вельмі важна гэтай восеньню і наступнай вясной не згубіць станоўчую дынаміку, якая выразна выявілася ўвесну 2000-га.

Мне падаецца, што восень будзе надзвычай складаная. Ня будзем зараз прагназаваць гладкае разьвіцьцё падзеяў, бо ўсё будзе цяжкім. Рэч у тым, што ў верагодным становіцца варыянт байкоту недэмакратычных выбараў, якія будзе навязваць рэжым Лукашэнкі. А ўсё гэта будзе выклікаць незвычайныя падзеі. Таму я думаю, што восень будзе канфліктнаю.

**Зьміцер БАНДАРЭНКА**, *каардынатар Хартыі'97*

Вясна – 2000, бадай, самая пасьпяховая акцыя апазыцыі за апошніх некалькі гадоў. Посьпех заключаецца ў тым, што апазыцыя дзейнічала скансалідавана, як адно цэлае. Была не адна масавая акцыя, а некалькі моцных буйных акцыяў. І яшчэ адзін станоўчы момант – тое, што гэтую скансалідаванасьць апазыцыі й падтрымку яе з боку народу заўважылі на Захадзе рэальна. Візыт аб'яднанай апазыцыі ў ЗША, у іншыя заходнія краіны якраз пацьвердзіў, што Вясна — 2000 не засталася незаўважанай у сьвеце. Нельга казаць пра восень. Што тычыцца

восені, то нельга казаць толькі пра "восень", трэба казаць і пра "Лета – 2000", якое будзе вельмі напружаным. Будзе праведзены Кангрэс дэмакратычных сілаў. Плянуецца правядзеньне перамоваў паміж партыямі аб агульных падыходах і сцэнарах у стасунку да магчымых выбараў. Будзе актывізаваная дзейнасьць апазыцыі і ў міжнародным кірунку. Беларуская апазыцыя павінная замацаваць посьпехі Вясны – 2000.

**Павал СЕВЯРЫНЕЦ**, ***старшыня Маладога Фронту:***

Менская Вясна – 2000, мне здаецца, – адна зь лепшых акцыяў апазыцыі за апошнія гады. І рэч тут зусім ня ў колькасьці людзей, якія выйшлі на вуліцы, ня толькі ў цудоўным зьнешнепалітычным эфэкце. Самае галоўнае – у глыбінных зьменах, што адбываюцца ў нашым грамадзтве. Вясна – 2000 сталася такой шматлікай, эфэктнай і эфэктыўнай менавіта таму, што ў беларускім грамадзтве адбываюцца калясальныя зьмены. Адбываецца пераменяньне пратэставай, радыкальнай, другаснай апазыцыі ў апазыцыю духовую й масавую. Падобную да той, якая 10 гадоў таму амаль ува ўсёй Усходняй Эўропе ажыцьцявіла пяючыя аксамітныя рэвалюцыі

Вясну – 2000 я ацэньваю перадусім як працэс нацыянальнага абуджэньня. Гэта пачатак. Аднак ня факт, што так лёгка ўсё пройдзе – будуць яшчэ і выпрабаваньні. Але тое, што нацыянальнае і духовае абуджэньне ў Беларусі пачалося – а нацыянальны рух набывае хрысьціянскую сутнасьць, на якой грунтуецца ўся цывілізацыя Захаду, сутнасьць, на якой і магчымае паўстаньне Беларусі як эўрапейскай краіны – гэта факт. І Вясна – 2000 мне здаецца вельмі вялікім посьпехам.

Хацеў бы зазначыць, што менавіта Малады Фронт пачаў і скончыў гэтую Вясну: 14 лютага — Акцыя Любові, а праз 3 месяцы – нацыянальныя сьцягі па ўсёй Беларусі і скандаваньне Маладога Фронту на Кастрычніцкім пляцы.

Прагнозы на восень у мяне больш асьцярожныя. Думаю, што шмат у чым будзе замінаць выбарчая мітусьня, арганізаваная ўладамі. Але працэс нацыянальнага й духовага абуджэньня ўвосень будзе ўзмацняцца яшчэ адным вельмі моцным чыньнікам – гэта хрысьціянізацыя, якая будзе ісьці да юбілею 2000 году. І гэты духовы ўздым, які адчуе уся нацыя, будзе толькі спрыяць гартаваньню нацыянальных сілаў, духовай апазыцыі ў першую чаргу. Цалкам дапускаю, што увосень могуць быць больш масавыя выступленьні за тыя, што былі вясною. Мірныя, але вельмі ўражлівыя выступы беларускай апазыцыі.

**Падрыхтаваў Аляксей ШЭІН**



***Нядаўна Васіль Быкаў, даючы ў Нямеччыне інтэрвію беларускай праграме Польскага радыё, адказаў і на пытаньні, што тычыліся БНФ. Прапануем адказы Народнага пісьменьніка ўвазе чытачоў нашай газэты.***

# Васіль Быкаў кажа пра Фронт

***— Вы былі адным з заснавальнікаў Беларускага Народнага Фронту. Як Вы ацэньваеце ягоную ролю цяпер, з пэрспэктывы часу, праз, бадай, 15 гадоў дзейнасьці?***

— Фронт - гэта была самая радыкальная, дэмакратычная палітычная сіла, цяпер яе называюць апазыцыяй. Заслугі БНФ у нацыянальным адраджэньні й дэмакратызацыі вельмі вялікія, думаю, што яны ўжо ўпісаныя ў гісторыю і так ці інакш ўплываюць на нацыянальную самасьвядомасьць цяперашніх і будучых пакаленьняў. Справа, аднак, у тым, што мэтады дэмакратычнага Беларускага Народнага Фронту як палітычнай сілы былі неадэкватныя мэтадам дыктатарскай улады ў Беларусі. Таму праз 10 гадоў вельмі актыўнай, радыкальнай барацьбы за нацыянальнае адраджэньне Фронт практычна пазбаўлены ўсіх сродкаў барацьбы. Апроч ідэі, у яго нічога не засталося - ні прадстаўніцтва ва ўладзе, ні доступу да СМІ. І цяпер, ня гледзячы на ўсю прынцыповасьць кіраўніцтва, Фронт знаходзіцца ў вельмі цяжкай сытуацыі.

***— А ці ня думаеце Вы, што менавіта з-за гэтай прынцыповасьці й радыкалізму Фронт аказаўся слабым? Людзі проста баяліся радыкалізму.***

— Так у нас гавораць ворагі БНФ і некаторыя прадстаўнікі элітных колаў. Але трэба мець на ўвазе, што у тых умовах, калі пачынаўся рух, гэты радыкалізм Фронту быў вельмі дарэчы, ён зрабіў сваё. У тым, што абсалютна правільны рух не набыў масавай падтрымкі ў народа, не прынес плёну, няма ягонай віны. Мусіць быць зьмененая палітыка Фронту ў дачыненьні да ўладаў, але што датычыць уладаў цяперашніх – то тут увогуле ня можа быць адэкватнай палітыкі, таму што дэмакратыя ня мае адэкватных сродкаў для барацьбы з дыктатурай. Гэта розныя зьявы, і іхныя мэтады не перасякаюцца. Пакуль адныя выпрацоўваюць пазыцыі, другія выклікаюць паліцэйскія сілы. І чыя будзе перамога? Але тым ня меней, Беларускаму Народнаму Фронту ўдалося скалыхнуць тую сьвядомую ўласнай вартасьці частку грамадзтва. Канешне, ва ўмовах дэмакратыі можна было б дамагчыся, каб гэтыя 10% сталіся пэўным нацыянальным фэрмэнтам, але паколькі ня ўдалося ўтрымаць сувэрэнітэту краіны, усё засталося так як ёсьць.

**Вольга ГАРДЗЕЙЧЫК,**
**Польскае Радыё, адмыслова**
**для "Навінаў БНФ"**

## Кроніка

### Адбыўся чэрвеньскі Сойм БНФ

***10 чэрвеня 2000 году прайшоў чарговы, чэрвеньскі Сойм БНФ "Адраджэньне".***

Галоўнымі пытаньнямі, якія разглядаліся на Сойме, былі палітычная сытуацыя ў краіне й арганізацыйнае ўзмацненьне БНФ. З дакладамі выступілі старшыня БНФ Вінцук Вячорка ды намесьнікі старшыні Вячаслаў Сіўчык і Анатоль Фёдараў.

Пасьля гарачых падзеяў Вясны – 2000, цяпер, у час пэўнага палітычнага зацішша, Фронт вырашыў скіраваць увагу на ўмацаваньне сваіх структураў у краіне. БНФ актыўна займаецца арганізацыйнай працай і перад Кангрэсам Дэмакратычных Сілаў, які мусіць адбыцца ў бліжэйшы час, і перад восеньскай палітычнай кампаніяй масавых акцыяў.

У гэты ж дзень, 10 чэрвеня, дэлегацыя сяброў Сойму была скіраваная на аргкамітэт правядзеньня "Ўсебеларускага зьезду за незалежнасьць".

**Прэсавая група БНФ «Адраджэньне» й партыі БНФ**

### Прайшла сустрэча В. Вячоркі й С. Шарэцкага

***16 чэрвеня ў Вільні прайшла сустрэча Вінцука Вячоркі й Сямёна Шарэцкага. Старшыня БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ ды сьпікер Вярхоўнага Савету 13 скліканьня абмеркавалі сёньняшнюю беларускую грамадзка-палітычную сытуацыю.***

Падчас сустрэчы была дасягнутая прынцыповая згода ў стаўленьні да задуманых рэжымам выбараў. У сытуацыі, якая склалася ў краіне, лічаць палітыкі, сапраўдных дэмакратычных выбараў быць ня можа. Тое, што мяркуе правесьці Лукашэнка ўвосень, будзе ня выбарамі, а звычайным фарсам.

Абмяркоўвалася таксама пытаньне пра грамадзка-палітычныя ініцыятывы, якія ўзьніклі ў Беларусі. Суразмоўцы выказаліся пра неабходнасьць таго, каб усе гэтыя ініцыятывы ўзгадняліся зь легітымным заканадаўчым органам Беларусі – Вярхоўным Саветам 13 скліканьня.

**Аляксей ШЭІН**

vytoki.net

*Інтэрвію лідэра БНФ Вінцука Вячоркі пасьля афіцыйнага візыту ў Вялікабрытанію й Злучаныя Штаты Амэрыкі*

# *Вінцук Вячорка:* "Тое, што мы пабачылі ў Вашынгтоне — беспрэцэдэнтна"

***— Сп. Вячорка, вы вярнуліся з афіцыйнага візыту, падчас якога наведалі дзьве заходнія сталіцы. Якія вынікі мела паездка?***

— Лёндан і Вашынгтон – гэта сталіцы, якія засьведчылі сваю прыхільнасьць да беларускай незалежнасьці хаця б тым, што ў 1994 годзе гарантавалі наш сувэрэнітэт пасьля таго, як Беларусь дабрахвотна адмовілася ад расейскай атамнай зброі. На эўрапейскім кантынэнце ёсьць некалькі сталіцаў, якія дэманструюць дастаткова пасьлядоўную лінію да Лукашэнкі – гэта Стакгольм, Прага і Лёндан. Хаця, на жаль, у Лёндана пад уладай лейбарыстаў былі розныя палітычныя піруэты (я маю на ўвазе пасьпешлівую паездку Тоні Блэра ў Пецярбург, дзе ён спрабаваў ці то паразумецца, ці то пачаць выхоўваць кагэбіста Пуціна). Але, тым ня менш, я пераканаўся, што абедзьве буйныя партыі, ня кажучы ўжо пра партыі меншыя (напрыклад, партыю валійскіх патрыётаў), і чыноўнікі зь Міністэрства замежных справаў, ведаюць нашую сытуацыю, падтрымліваюць імкненьне Беларусі да незалежнасьці й дэмакратыі.



У цэнтры – Сэм Гейдэнсан, аўтар Рэзалюцыі Кангрэсу ЗША пра Беларусь



Разам з Джэсі Хэлмсам, старшынём сэнацкай Камісіі міжнародных справаў.

А тое, што мы пабачылі ў Вашынгтоне – гэта сапраўды беспрэцэдэнтна. Беларуская тэма, беларуская праблематыка стала "моднаю" ў Вашынгтонскіх палітычных колах. З намі выказалі жаданьне сустрэцца найбольш уплывовыя [illegible], сярод іх былі і Зьбігнеў Бжэзінскі, які ёсьць экспэртам для ўсяго заходняга сьвету ў тым, што стасуецца эўрапейскай, і наагул — геапалітыкі, і сэнатар Джон МакКейн, нядаўні кандыдат у прэзыдэнты ад Рэспубліканскай партыі, які адмыслова прыйшоў на прыняцьцё з нашым удзелам і выступіў з палымянай прамовай у падтрымку беларускай незалежнасьці. Мы дамагліся нашым візытам таго, што ўжо запушчана "ў вытворчасьць" рэзалюцыя Сэнату наконт Беларусі (пасьля рэзалюцыі Кангрэсу яна, магчыма, будзе яшчэ мацнейшай); што беларускае пытаньне пастаўлена ў парадак дня сустрэчы Клінтана з Пуціным. Мы пачулі поўную падтрымку нашага "прынцыпу чатырох пазыцыяў". Чатыры варункі выбараў і пэўны час для іх рэалізацыі пасьля іх дасягненьня, і затым – свабодныя, дэмакратычныя, прызнаныя сьветам выбары. Гэта ва ўсіх вашынгтонскіх кабінэтах было цалкам падтрымана.

***— Які імідж мае Беларусь у палітыкаў гэтых заходніх краінаў?***

— Я б сказаў, што зьменны. Яшчэ 8 – 9 гадоў таму нават чыноўнікі, магчыма, не знаходзілі нашую краіну на мапе. Потым мы выклікалі цікавасьць нагэтулькі, наколькі вывозіліся ракеты з нашай тэрыторыі. Пасьля наступіла забыцьцё. І толькі разгул дыктатуры ў нашай краіне, прыход да ўлады "чорнага ката ў чорным пакоі" – Пуцына, і самае галоўнае, — рэзкая актывізацыя незалежніцкіх сілаў за апошні год, змусіла зноў заўважыць Беларусь на мапе.

Які імідж мае Беларусь? Імідж краіны, якая, насуперак геапалітычным законам, геапалітычнаму вэктару раптам апынулася ў сфэры ўплыву адроджанай імпэрскай Расеі. Гэта выклікае, перадусім у амэрыканскіх палітыкаў, дзеячоў, якія ўважаюць Амэрыку за апірышча дэмакратыі, жаданьне дапамагчы аднаўленьню дэмакратыі, а там самым – і незалежнасьці Беларусі.

***— Вядома, што падчас паездкі вы сустракаліся таксама і зь беларускай дыяспарай.***

— Будучы ў Брытаніі, я ніколі не абмінаю магчымасьці спаткацца з а. Аляксандрам Надсанам, які ёсьць ня толькі духоўным лідэрам беларускіх грэка-каталікоў, але й сапраўдным маральным і палітычным лідэрам беларусаў Вялікабрытаніі. Скажу, што ён выдатна арыентуецца ў беларускай сытуацыі, і ў гэтым я зноў пераканаўся.

Я ўзнавіў кантакты з асноўнымі дзеячамі беларускай дыяспары ў Злучаных Штатах. Меў доўгую тэлефонную размову зь Іванкай Сурвілай (Прэзыдэнтам

vytoki.net

Рады БНР) і такімі аўтарытэтнымі дзеячамі, як Янка Запруднік, Вітаўт Кіпель, Антон Шукелойць, дзеячамі маладзейшых хваляў беларускай эміграцыі: цяперашнім кіраўніком Беларуска-амэрыканскага задзіночаньня (БАЗА) Віталём Зайкам. Я пераканаўся ў тым, што мы мусім вельмі шчыльна кантактаваць зь беларусамі на чужыне, пастаянна забясьпечваць іх шматбаковай інфармацыяй і дакумэнтамі, якія тут зьяўляюцца й цыркулююць, і я цешуся, што абсалютна ўсе ацэнкі беларускага палітычнага становішча ў нас і кіраўніцтва БНР, кіраўніцтва БАЗА – супадаюць. Дарэчы, кіраўніцтва БАЗА (Запруднік, Зайка, Алеся Кіпель і Расьціслаў Завістовіч) наведалі Вашынгтон праз тыдзень пасьля нас, і, фактычна, замацавалі наш замежнапалітычны посьпех ды скарысталі свой натуральны ўплыў, бо яны – гэта тая сіла, да якой Вашынгтон мусіць прыслухоўвацца.

Мы паразумеліся ў такім спэцыфічным пытаньні, як правядзеньне Ўсебеларускага зьезду. І ў БНФ, і ў беларускай дыяспары ёсьць трывога: каб жа толькі не здэвальваваць Усебеларускі зьезд як ідэю, каб ён ня быў проста банальным чарговым сходам, і, разам з тым, каб не была падважаная легітымнасьць і Рады БНР, і Вярхоўнага Савету 13 скліканьня. Мы дамовіліся пра беззупынны кантакт і каардынацыю з кіраўніцтвам Рады БНР у стаўленьні да Ўсебеларускага зьезду.

***— На Ваш погляд, чаму Лукашэнка так нэрвова адрэагаваў на візыт аб'яднанай апазыцыі ў Амэрыку?***

Таму што гэта яганая замежнапалітычная параза. Ён меркаваў, што сваёй гульнёй у дыялёг, маніпуляцыямі і частковымі систупкамі (напрыклад, тое, што Чыгіра не пасадзілі ў турму, а адклалі прысуд), ён здолее схіліць кантынэнтальных эўрапейцаў да сцэнару, да якога яны й так звычайна былі схільныя: да спробаў доўгіх і бясплённых размоваў, каб пераканаць дыктатара. Мы памятаем, што польскай "Салідарнасьці" дапамагалі больш не кантынэнтальныя краіны, а Злучаныя Штаты, Вялікабрытанія, Швэцыя. І (не хачу праводзіць беспасярэдніх паралеляў), на вялікі жаль, часам паводзіны эўрапейскіх краінаў нагадваюць стравусіныя.

Лукашэнка быў перакананы, што вось-вось ягоны "дыялёг" будзе прызнаны АБСЭ як спосаб выйсьця з палітычнага крызысу. Аж тут раптам на найвышэйшым узроўні, узроўні міжнародных камісіяў абедзьвюх палатаў амэрыканскага парлямэнту сьцьвярджаецца зусім адваротнае. А вага Злучаных Штатаў – гэта вага Злучаных Штатаў. Для Лукашэнкі стала абсалютна ясна, што ён праваліўся. Вось адкуль нэрвовасьць, неўраўнаважанасьць і пагрозы.

[illegible]ў Аляксей ШЭЙН

## Яўгена Скочку зноў могуць пасадзіць

***20 чэрвеня скончыўся год адтэрміноўкі па крымінальнай справе намесьніка старшыні Маладога Фронту Яўгена Скочкі. Роўна год таму судзьдзя В. Камісараў у Менскім гарадзкім судзе вынес Яўгену абвінаваўчы прысуд за арганізацыю 14 лютага 1999 году несанкцыянаванага маладзёвага шэсьця «Беларусь у Эўропу-4», якое скончылася велізарным фаервэркам і арыштам дзесяткаў удзельнікаў: "Адзін год зняволеньня з адтэрміноўкай на адзін год".***

Увесь год улады нэрвова спрабавалі справакаваць ці затрымаць Яўгена на маніфэстацыях (праўда, маладафронтаўцы Жэню ратавалі), слалі пагрозьлівыя павесткі, неаднаразова выклікалі ў пракуратуру.

На днях, па заканчэньні выпрабавальнага тэрміну, справу Яўгена Скочкі перадалі ў суд Навабеліцкага раёну Гомеля, які павінны ў бліжэйшы час адказаць на пытаньне, ці пасадзяць Яўгена на 1 год у турму.

Гэта ўжо шостая (6!) крымінальная "палітычная" справа, па якой праходзіць намесьнік старшыні Маладога Фронту Яўген Скочка.

**Прэс-служба Маладога Фронту**

## Малады Фронт ня хочуць рэгістраваць

***Больш за месяц таму Малады Фронт падаў у Міністэрства юстыцыі дакумэнты на рэгістрацыю. Як вядома, Мінюст абавязаны разглядаць такія справы ў месячны тэрмін.***

Маладафронтаўцы, якія апошнімі днямі настойліва спрабавалі высьветліць лёс маладзёвага грамадзкага аб'яднаньня "Малады Фронт", аказаліся перад фактам відавочнага *парушэньня закона.*

Выканаўца, які прызначаны для разгляду дакумэнтаў Маладога Фронту, Станіслаў Шляхто, 21 чэрвеня заявіў старшыні арганізацыі Паўлу Севярынцу, што на гэты момант справа МФ знаходзіцца ў так званай "камісіі Замяталіна" і даць адказ на простае пытаньне – ці зарэгістравалі "Малады Фронт" – ён ня можа.

МФ зьвяртае ўвагу на тое, што такім чынам Міністэрства юстыцыі відавочна парушае закон "Аб грамадзкіх аб'яднаньнях".

Управа Маладога Фронту накіроўвае ліст спадару Сухініну, загадчыку аддзелу рэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў, з патрабаваньнем даць адказ.

Маладафронтаўцы не выключаюць, што такая пазыцыя Мін'Юста звязана з набліжэньнем 1 ліпеня, калі павінны адбыцца Сойм Маладога Фронту, на якім плянуецца прыняць праграму для ўсяго нацыянальнага руху моладзі.

**Прэс-служба Маладога Фронту**



## Паўлу Севярынцу не давалі абараніць дыплём

***Студэнт V курса геаграфічнага факультэту БДУ, лідэр Маладога Фронту Павал Севярынец, які ў гэтым годзе мусіў скончыць навучаньне ў спэцыяльнасьці "геалёгія", 15 чэрвеня ня быў дапушчаны да абароны сваёй дыплёмнай працы "Бурштын Беларусі". Дэкан факультэту, Іван Іванавіч Пірожнік, не дазволіў абараняць дыплём, напісаны беларускай мовай у клясычным (тарашкевіцкім) правапісе, і наклаў на тытульным аркушы рэзалюцыю (на мове арыгінала): "В таком виде работа не может быть допущена к защите в государственной экзаменационной комиссии."***

Зьвяртае на сябе ўвагу, што ўсе спэцыялісты-геолягі, якія ўваходзілі ў камісію (у т.л. і знакаміты акадэмік Р. Гарэцкі), дыплём да абароны прынялі — але ў апошні момант працай студэнта Севярынца зацікавіўся географ І. І. Пірожнік. (Вядомыя прэцэдэнты, калі студэнты й асьпіранты розных беларускіх ВНУ выконвалі й пасьпяхова абаранялі курсавыя, дыплёмныя й навуковыя працы менавіта ў клясычным беларускамоўным варыянце. Больш за тое, яшчэ сьвежая гісторыя з газэтай "Наша Ніва", якая выйграла падобны суд у Дзяржкамдруку).

Аданак, праз некалькі дзён, калі беларускія СМІ гучна загаварылі пра гэтую гісторыю, дэканат здаўся. Прадстаўнікі дэканату патэлефанавалі ўва Ўправу БНФ, знайшлі там Паўла Севярынца й паведамілі, што абарона ягонага дыплёму ўсё ж такі дазволеная. Яе перанесьлі на 27 чэрвеня. Такім чынам,- старшыня МФ выйграў супрацьстаяньне і будзе абараняць працу, напісаную тарашкевіцай. Праўда, за гэты час ягоныя аднагрупнікі дыплёмы ўжо атрымалі.

**С.А.**

## Каб ня клеілі

У ноч з 3 на 4 чэрвеня падчас расклейкі ўлётак былі затрыманыя двое сяброў Койданаўскае рады Маладога Фронту – Яўген Афнагель і Павал Камоска. Іх адвезьлі ў Маскоўскі РАЎС. Там іх пратрымалі з 2.30 ночы да 6 гадзінаў раніцы. На хлопцаў склалі пратаколы, а таксама канфіскавалі ўлёткі з кантактамі Койданаўскай Рады МФ.

**Г. А.**

vytoki.net

# Грозны, помста паўстанцаў



*Разбураны Грозны*

Якая б ні была вайна — з усім можна звыкнуцца. Зараз, калі ў былой разбуранай сталіцы Чачэніі не засталося каменя на камяні, Расея беспасьпяхова спрабуе пераканаць сябе й міжнародную супольнасьць у тым, што паўстаньне padaўленае. "Зараз час пачынаць рэканструкцыю," – кажа афіцэр расейскай арміі, якому даручана суправаджаць у паездцы нешматлікую групу заходніх журналістаў: яны разьмясьціліся на бранятанку, схапіўшыся за рулю гарматы. Танк прыкрываюць салдаты з аўтаматамі напагатове. Афіцэр выглядае ўпэўненым. Аднак яго людзі працягваюць уважліва глядзець вакол, таму што, калі будзе засада, трэба пачаць страляць першымі. Салдаты нашмат больш думаюць пра выжываньне, чым пра нейкую рэканструкцыю.

Ночцу, практычна кожную ноч, узброеная барацьба працягваецца ня толькі ў горных раёнах Чачэніі, дзе гаспадараць баевікі, але і ў "вызваленым ад тэрарыстаў" Грозным. Больш ня чутна бесьперапынных выбухаў авіяцыйных бомбаў і артылерыйскіх снарадаў — у Грозным амаль няма чаго разбураць. Розьніца адно ў тым, што цяпер у Чачэніі ідзе толькі партызанская вайна. У ходзе гэтай, ужо хранічнай, вайны, не ўлічваючы ахвяраў сярод грамадзянскага насельніцтва і паўстанцаў, фэдэральныя войскі й расейскія сілы бясьпекі згубілі забітымі 2.300; 6.700 чалавек параненыя.



*Расейцы глядзяць на Чачэнію праз аптычны прыцэльнік*

Апошнія навіны абвяргаюць ўсе ўпэўненыя заявы Масквы аб тым, што, па меншай меры, у так званых "вызваленых раёнах" Чачэніі вайна ўжо скончылася – у пяці кілямэтрах ад сталіцы ў выніку выбуху дзьвюх радыёкіравальных фугасаў быў зьнішчаны аўтамабіль, у якім знаходзіліся мэр Грознага Супьян [illegible] месьніца, а таксама намесьнік старшыні расейскай грамадзкай адміністрацыі ў Чачэніі Сяргей Зьвераў.

Тэрарыстычны акт, у выніку якога загінулі два намесьнікі, а мэр Грознага быў паранены, у чарговы раз ставіць пад сумненьне шырока рэклямаваны посьпех у крывавай ваеннай апэрацыі Масквы на Каўказе.

Нягледзячы на прысутнасьць 80 тысячаў вайскоўцаў (паводле зьвестак чачэнцаў – больш за 200 тысячаў) супраць 3 тысячаў баевікоў, да гэтага часу не была дасягнутая асноўная мэта любой стратэгіі барацьбы з паўстанцамі: ізаляцыя кіраўнічага ядра паўстанцаў ад шырокіх масаў і патэнцыяльных паплечнікаў. Для працягваньня сваёй дзейнасьці кіраўнікі паўстанцаў павінны мець абсалютную свабоду дзейнасьці. Гэтая дактрына распрацаваная адным з самых крывавых тыранаў, але разам з тым – самым дасьведчаным стратэгам рэвалюцыйнага тэрарызму, таварышам Мао Цзэдунам.

Пры гэтым асноўнай праблемай у Грозным застаецца выжываньне. Пра якую рэканструкцыю можна казаць у горадзе, разбураным на 80%. У людзей, што жывуць у Грозным, дзе да гэтых дзьвюх войнаў колькасьць насельніцтва складала 500 тысячаў жыхароў, дзе пасьпяхова працавалі буйныя прамысловыя прадпрыемствы й дзейнічаў унівэрсытэт, няма ні сьвятла, ні вады. Гэтыя 20 ці 30 тысячаў людзей, што пражылі вайну, ня вераць у спробы адбудаваць горад. "Дзе гэтыя бандыты? Можа, мы бандыты, тыя, хто засталіся тут толькі таму, што нам больш няма куды бегчы і няма ад каго чакаць дапамогі?"—пытаецца старая жанчына. Яна больш не атрымлівае пэнсію і вымушаная жыць разам зь іншымі, хто згубіў дах, у чыгуначных вагонах.

Пяцідзесяцігадовы Аслан, мяркуючы па імені, мусульманін, лічыць, што яму пашанцавала больш. "Мне, за тое, што я праслужыў 15 гадоў у савецкай арміі, рускія пачалі плаціць пэнсію па інваліднасьці. 140 рублёў у месяц, на якія можна набыць тры з паловай кілягрмы памідораў. Але я, зразумела, не магу дазволіць сабе памідораў!". Вось так. Нават у банальнасьці гэтых выказваньняў заключаная сутнасьць канфлікту, які, калі ён ня скончыцца ў самы бліжэйшы час, будзе спрыяць узмацненьню салідарнасьці простых людзей з экстрэмістамі, якія тэарытачна абгрунтоўваюць неабходнасьць узброенай барацьбы, злачыннымі элемэнтамі, якія карыстаюцца сёньняшнім станам хаосу, і групамі, якія ў Маскве лічаць тэрарыстычнымі. У такім выпадку вайна ў Чаэніі можа перакінуцца на ўвесь Каўказ.

**Да друку падрыхтавала**
**Алеся МАРЦІНКЕВІЧ**
**паводле "Corriera della Sera"**

vytoki.net

# Вячаслаў Сіўчык: “Запрашаю ўсіх сяброў КХП вяртацца ў БНФ”

***Днямі менскае кіраўніцтва КХП-БНФ адправіла ліст, адрасаваны сябрам КХП, дзе адсутнічаюць суполкі партыі. Аднак ліст гэты, як стала вядома, атрымліваюць і сябры некаторых рэгіянальных структураў БНФ “Адраджэньне” й Партыі БНФ. У лісьце, між іншага, гаворыцца, што толькі КХП-БНФ ёсьць адзіным легітымным Фронтам; акрамя таго, ад імя КХП прапануецца правесьці “пераўлік сяброў грамадзкага аб'яднаньня “Беларускі Народны Фронт “Адраджэньне”. Вось што гаворыць на гэты конт намесьнік старшыні БНФ “Адраджэньне” й Партыі БНФ Вячаслаў Сіўчык.***

– Я быў вельмі зьдзіўлены, калі зьявіўся пакет дакумэнтаў да сябраў Грамадзкага аб'яднаньня БНФ “Адраджэньне” ад кіраўніцтва КХП. Рэч у тым, што падчас правядзеньня другой сэсіі апошняга, IV Зьезду БНФ “Адраджэньне”, я ні разу не пакінуў залю паседжаньняў, быў і на той частцы, што праводзілася прыхільнікамі Пазьняка. Я быў глыбока перакананы ў тым, што гэтыя людзі хочуць пакінуць у спакоі грамадзкую арганізацыю. Існуюць відэа- і аўдыёзапісы таго, што адбывалася падчас правядзеньня Зьезду. Больш таго, кіраўнік МФ Павал Севярынец усё ж такі здолеў атрымаць там слова і ў адкрытую прасіў гэтых некалькі дзесяткаў чалавек, якія засталіся ў залі, не расколваць Народны Фронт, а прыняць удзел у працы другой сэсіі Зьезду.

Але цяпер нашыя калегі падумалі, што за тыя паўгады, якія нас аддзяляюць ад другой сэсіі, шмат хто забыўся пра тое, што было ўвосень. Таму цяпер і пайшлі пакеты дакумэнтаў, дзе сьцьвярджаецца, што КХП зьяўляецца (ні больш, ні менш) легітымным Народным Фронтам “Адраджэньне”, хаця ўсім вядома, і дзе знаходзіцца Фронт у Менску, і тое, што пасьля восеньскіх падзеяў рэальна ўзьнікла дзьве партыі. І гэта не азначае, што мусяць узьнікнуць два рухі БНФ “Адраджэньне”. Я думаю, што ў сёньняшніх умовах, калі трэба скансалідаваць усё для барацьбы за незалежнасьць, каб лукашэнкаўскі рэжым ня быў тут вечным, неабходна вельмі ўважліва ставіцца да ўсіх палітычных ініцыятываў, якія ўзьнікаюць, прычым ня толькі ўва Фронце.

Я хацеў бы нагадаць, што кіраўнікі Партыі БНФ пасьлядоўна змагаліся з сёньняшнім рэжымам. Невыпадкова, што гэта адзіная беларуская партыя, большасьць кіраўнікоў якой прайшла праз крымінальныя справы, незаконна ўзбуджаныя лукашэнкаўскім рэжымам. Я хацеў бы нагадаць, што і Вінцук Вячорка, і Юры Хадыка, і Павал Севярынец, і я – праходзілі ў 96-99-х гадах па шэрагу крымінальных справаў. БНФ спрабуе ў гэтых няпростых умовах скансалідаваць усе наяўныя сілы, і правядзеньне Вясны-2000 паказала, што такія сілы ў Беларусі ёсьць.

Сёньня кіраўніцтва Фронту робіць усё магчымае, каб падчас правядзеньня рэжымам сваіх выбараў апазыцыя не была расколатая. Мы імкнемся зрабіць усё, каб апазыцыя ў гэтых выбарах ня ўдзельнічала і такім чынам ня дала рэжыму магчымасьці легалізаваць уладу. У гэтых варунках нам сапраўды варта было б падумаць, што і як можна была б зрабіць, каб палепшыць сытуацыю ў Народным Фронце.

Толькі Маскве, толькі рэжыму карыс-

Працяг на стар. 8

Рэха

# Адплата па-беларуску?

***Джэржаўны Дэпартамэнт патрабаваў ад Беларусі спыніць перасьлед апазыцыйных лідэраў, якія нядаўна наведалі Вашынгтон. Але беларускі амбасадар Валеры Цапкала заявіў, што Злучаныя Штаты няправільна тлумачаць заўвагі Аляксандра Лукашэнкі.***

Усё пачалося з таго, што супрацоўнік Дзяржаўнага Дэпартамэнту Філіп Рыкер зрабіў закід Лукашэнку з той прычыны, што той пагражаў адпомсьціць палітычнай дэлегацыі апазыцыйных лідэраў і назваў апазыцыю пагрозай бясьпекі Беларусі. У адказ Лукашэнка распаўсюдзіў плёткі, што дэлегацыя шукала грошы ў Злучаных Штатах, каб скінуць урад. Спадар Рыкер заявіў: “Любая спроба помсты тым асобам, якія прысутнічалі на сустрэчы ў Вашынгтоне, будзе сур'ёзнай памылкай у падрыхтоўцы да выбараў сёлета, а таксама будзе перашкаджаць аднаўленьню дэмакратычнага працэсу ў Беларусі. Мы настойваем, каб Лукашэнкаўскі рэжым уступіў у адкрытыя перамовы з апазыцыяй аб правядзеньні свабодных і дэмакратычных выб... палітычны крызіс, што пануе ў краіне.”

Злучаныя Штаты падтрымалі апазыцыю ў адмаўленьні вынікаў рэфэрэндуму 1996 году, калі быў распушчаны парлямэнт, узмацнілася ўлада Лукашэнкі і быў падоўжаны тэрмін ягоных паўнамоцтваў.

Але беларускі амбасадар паведаміў што ён плянуе сустрэцца з Дзяржаўным Дэпартамэнтам, каб растлумачыць, што Лукашэнку няправільна працытавалі.

“Мы ўвесь час спрабуем растлумачыць гэта Дзяржаўнаму Дэпартамэнту” – заявіў ён. Цэпкала таксама паведаміў, што ён “ня ведае крыніцу інфармацыі”, якая распаўсюджвае аб пагрозах, якія прыпісваюць Лукашэнку. Амбасадар сказаў, што Лукашэнка нават спрабаваў правесьці “палітычны дыялёг з палітычнымі партыямі”, а апазыцыйная дэлегацыя яго праігнаравала. “Ён запрашаў апазыцыю сустрэцца зь ім”, — заявіў Цэпкала. Амбасадар таксама паведаміў, што Лукашэнка нязгодны з тактыкай апазыцыі ў спробах шукаць палітычную падтрымку ў Злучаных Штатах.

Дзяржаўны Дэпартамэнт рэгулярна гаворыць пра парушэньні правоў чалавека Лукашэнкам.

Пасьля сустрэчы з беларускімі палітыкамі старшыня Рады Міжнародных дачыненьняў Джэсі Гэлмс заверыў дэлегацыю ў сваёй падтрымцы. Ён заявіў, што выступае гарантам усебаковай падтрымкі з боку ЗША для беларускіх дэмакратычных і гармдзянскіх групаў.

**Пераклала з ангельскай мовы**
**Алеся Марцінкевіч паводле**
**“Washington Time”**

vytoki.net

## Кроніка

### Пікетаваць толькі за грошы

Цікавую пастанову выдалі чыноўнікі слуцкага гарвыканкаму. Рэч у тым, што не так даўно мясцовыя настаўнікі вырашылі правесьці пікет, пратэстуючы супраць нізкіх заробкаў. Настаўнікі занесьлі заяву ў гарвыканкам і атрымалі адказ у выглядзе палажэньня «Аб парадку аплаты расходаў, зьвязаных з правядзеньнем масавых мерапрыемстваў у г. Слуцку». Цяпер мітынгоўшчыкам давядзецца спачатку перавесьці на рахунак грошы памерам шэсьць мінімальных заробкаў і аддаць квіток у выканкам. Пасьля ўсіх працэдураў можна ісьці ды пікетаваць.

**Алёна ВАЛЫНЕЦ**

### Як жывем?

Пакупная здольнасьць сярэднемесячнай заработнай платы ў Беларусі працягвала зьніжацца на працягу ўсяго мінулага дзесяцігодзьдзя. Калі ў далёкім 1991 годзе сярэдні беларус меў магчымасьць на месячную зарплату набыць 97 кг мяса ці больш за тону малака, то ў 1998 годзе гэтыя лічбы склалі адпаведна 54 кг і 572 кг, у 1999-м - 61 і 605. Паводле статыстыкі, сёньня на сярэднюю зарплату мы ў стане набыць 37 кілаграмаў мяса ці 404 кілаграмы малака. У 91-м на заробак мы маглі набыць 77 кг масла альбо 275 кг цукру, зараз толькі 32 альбо 174 адпаведна. Затое цяпер беларус, месяц папрацаваўшы, можа прыдбаць 340 кг нацыянальнага стратэгічнага прадукту - бульбы, нават на 10 кілаграмаў больш, чым у 98-м. Праўда, дзесяць год таму гэтая лічба складала 655 кг. Адзіны паказьнік, у якім апошнім часам адбываецца адносны рост - гэта хлеб. Сёньня жыхар краіны за сярэднемесячны заробак набудзе 343 кілаграмы хлебу, а ў 98-м - толькі 250 кг. У 91-м гэты паказьнік быў на роўні 507 кілаграмаў.

### Як зарабляем?

На сёньняшні момант у Беларусі заробкі ніжэйшыя за «рысу беднасьці» атрымліваюць больш мільёну працоўных грамадзянаў. Агулам у краіне 80% людзей атрымлівае даходы (з разьліку на аднаго чалавека) ніжэй за мінімальны спажывецкі бюджэт, 47% - ніжэйшыя за неабходны жыцьцёвы мінімум.

**BARC**

## Хто ёсьць хто ў Фронце

# Алесь Бяляцкі

*Намесьнік старшыні БНФ «Адраджэньне» й Партыі БНФ*



Нарадзіўся 25.09.1962 г. у Карэліі (Расея), у 1984 г. скончыў Гомельскі ўнівэрсытэт (беларуская й расейская філялёгія), у 1989 г. — асьпірантуру Інстытуту літаратуры беларускай Акадэміі Навук. Працаваў настаўнікам, навуковым супрацоўнікам, дырэктарам Літаратурнага Музэя Максіма Багдановіча (Менск). З 1982 году ўдзельнічаў у падпольнай маладзёвай антыкамуністычнай арганізацыі, быў адным з арганізатараў маладзёвага дэмакратычнага руху ў Беларусі ў другой палове 80-х. Уваходзіў у арганізацыйны камітэт аднай зь першых праваабарончых арганізацыяў у Беларусі «Мартыралёг Беларусі» (1988), масавага дэмакратычнага руху «Беларускі Народны Фронт «Адраджэньне» (1988). У 1991-95 гг. быў дэпутатам Менскага гарадзкога савету. Алесь Бяляцкі – намесьнік старшыні БНФ «Адраджэньне», сябра Саюзу пісьменьнікаў Беларусі. За актыўную грамадзкую і праваабарончую дзейнасьць А. Бяляцкі больш за 20 разоў прыцягваўся да судовай адказнасьці камуністычнымі й посткамуністычнымі ўладамі.

У 1996 г. Алесь Бяляцкі стаў адным з заснавальнікаў Праваабарончага Цэнтру «Вясна-96», які з 1999 г. мае назву: Праваабарончы Цэнтар «Вясна», старшынём якога ён ёсьць і зараз.

## Ад першай асобы

# *Вячаслаў Сіўчык: “Запрашаю ўсіх сяброў КХП вяртацца ў БНФ”*

*Працяг на стар. 7*

на тое, што ёсьць два Франты. Падчас VI Зьезду адбылося выдзяленьне групы людзей у асобную Кансэрватыўна-хрысьціянскую партыю. Яны маюць на гэта права, але калі яны думаць аб Беларусі, пра будучыню, то, натуральна, мусяць быць унармаваныя стасункі паміж КХП і БНФ. У партыю БНФ сёньня ўваходзяць такія вядомыя у Беларусі людзі, як Уладзімер Арлоў, Анатоль Грыцкевіч, Рыгор Барадулін, Артур Вольскі, і іншыя. Я бачу, што ў гэтай сытуацыі мусіць быць падпісанае пагадненьне паміж двума партыямі (я нават лічу, што КХП мае права таксама і на абрэвіятуру БНФ, бо паходзіць з Народнага Фронту). На мой погляд, гэта задача рэжыму – паклёпнічаць на апазыцыю, пасьлядоўна займацца ачарненьнем лідэраў. Я магу даць справаздачу пра тое, што было зроблена кіраўніцтвам Партыі БНФ за мінулыя паўгады. На вялікі жаль, я не магу прыгадаць нічога за апошнія паўгады, што можна было аднесьці на рахунак маіх калегаў, зь якімі мы разам змагаліся супраць рэжыму яшчэ зусім нядаўна, і якія ўтварылі новую партыю.

Мне хацелася б, каб канфлікт на роўным месцы быў вычарпаны вось гэтым апошнім лістом. Сытуацыя такая, што ў нашых рэгіянальных аддзелах і так хапае ціску з боку рэжыму, бо ёсьць дыктатура, якая мае рэальныя спэцслужбы, КДБ. А калі будзе ісьці ціск на нашых актывістаў з боку КХП – гэта проста занадта. Таму мне хацелася б, каб быў улагоджаны канфлікт, якога ня мусіць быць. Я з свайго боку запрашаю ўсіх сябраў КХП вяртацца ў БНФ “Адраджэньне”, прыходзіць да нас ва Ўправу Фронту. Нічога насамрэч не зьмянілася. Сёньня тая ж сытуацыя, зь якой мы спрабуем замагацца ўжо 6 гадоў. Працягваецца акупацыя з боку Масквы, і мы мусім зьвяртаць увагу не на суб'ектыўныя фактары. Адказнасьць сёньня ляжыць на ўсіх – і на кіраўніцтве Партыі БНФ, і на КХП, і на шараговых актывістах. Бо калі людзі, якія існуюць у адным ідэалягічным полі ня могуць дамовіцца – гэта нонсэнс.


**НавінЫ**

БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ "АДРАДЖЭНЬНЕ"

№ 4 (21), чэрвень 2000 г, наклад 299 асобнікаў

Распаўсюджваецца бясплатна на правах нут-

У нумары скарыстаная выява Пагоні з тытульнага аркуша Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.

Адрас для ліставаньня: 220006, Менск, а/с 27, тэл. 284-50-12

E-mail: bnf@journalist.com

в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч


vytoki.net